# ДА 60-ГОДДЗЯ

# АЛЕСЯ МІКАЛАЕВІЧА КАРЛЮКЕВІЧА



**Дарагі Алесь Мікалаевіч!**

Сардэчна віншуем Вас з 60-годдзем. Хочацца зрабіць гэта не афіцыйна і пампезна, а пасяброўску. Таму што менавіта душэўная цеплыня, уласцівая сапраўдным беларусам шчырая народная непасрэднасць, спагадлівасць ляжаць у аснове нашых з Вамі ўзаемаадносін. Гэта спрыяе нашаму эфектыўнаму дыялогу не толькі ў вузкім фармаце «кіраўнік – падначаленыя», але і ў больш шырокім гуманістычным рэчышчы, падкрэслівае не толькі Вашы лідэрскія якасці, арганізатарскія здольнасці, але і характарызуе Вас лёгкім у зносінах, светлым, гарманічным чалавекам, нашым сапраўдным сябрам і аднадумцам. Жадаем Вам моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, творчага натхнення, новых дасягненняў у справе развіцця літаратурных традыцый Беларусі і практычнай рэалізацыі свяшчэннай для ўсіх нас ідэі саюзнасці. **З ЮБІЛЕЕМ!**

**Калектыў**
**Гродзенскага абласнога аддзялення**
**Саюза пісьменнікаў Беларусі**

6 студзеня 2024 года
Гродна – Мінск

